## ЛІСТ АД ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА

# Хоцімскі храм

**Добры дзень, дарагія мае землякі!**

**Пасылаю вам верш, які не мог не напісаць у сувязі з вялікай нагодай – узнагароджаннем настаяцеля Хоцімскага Свята-Троіцкага храма. Спадзяюся, што вы яго надрукуеце. Перадаю шчырае вітанне ўсім, хто яшчэ ведае і помніць мяне на роднай зямлі.**

**Ваш Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нядаўна была прысуджана прэмія "За духоўнае адраджэнне" 2002 года сярод іншых грамадскіх дзеячоў і настаяцелю Свята-Троіцкага храма ў г.п. Хоцімск Магілёўскай вобласці – Бадзічу Алексею Пятровічу (архімандрыту Кірылу).

Гэта вестка мне асабіста прынесла вялікую радасць, як і ўсім маім землякам. З Хоцімскім святым храмам звязаны жыццёвы лёс усіх нас. Мая вёска Альшоў, напрыклад, знаходзіцца ў прыгарадзе гарадскога пасёлка. Сюды ўсе аднасяльчане хадзілі маліцца Усявышняму ў святы і будні. У гэты храм мяне родная мама Марыя разам з дзедам Яхімам прыносілі перахрысціць святым крыжам адразу пасля нараджэння. Затым у дзяцячым і юнацкім узросце я прыходзіў часта сюды сам прычасціцца перад Божай іконай. Не мог я тады і ўявіць, што адбудзецца тут на пачатку трыццатых гадоў: царкву малую ў Хоцімску разбурылі зусім, а з храма знялі крыжы і купалы, пакінулі толькі сцены, арганізавалі ў іх так званы раённы Дом культуры. Ну і за гэта дзякуй, што далі сценам уцалець: яны прастаялі доўгія гады, не спаленыя нават вогнішчамі спусташальнай вайны...

Прайшлі гады. Усё стала вяртацца на сваё месца. І вось на шчасце і радасць усім нам настаяцель архімандрыт Кірыл па сваёй ініцыятыве, пры дапамозе ўсіх землякоў роднай Хоцімшчыны аднавілі ў гарадскім пасёлку святы Свята-Троіцкі храм. Зноў сюды натоўпамі пайшлі веруючыя людзі памаліцца Усявышняму за выратаванне сваіх душ ад розных бедаў і нягодаў. Зноў загучалі званы непакаронай святыні.

Вось чаму я не мог не адгукнуцца на гэту падзею і не напісаць верша, прысвечанага ёй, як гістарычнай, хвалюючай падзеі.

Храм гэты працай людзі
аднаўлялі,
У яго ўсе душы ўкладвалі свае.
І Бесядзь збоч нібыта
свае хвалі
Улівае ў звон, што голас
падае.
А шчэ нядаўна, у былым
стагоддзі,
Калі блюзнёрству
не было мяжы,
У раз`юшанай, шалёнай
непагодзе
З яго здымалі купалы, крыжы
Якойсьці нехрысты
жадалі змены,
І над крыжамі верх свой узялі.
Ды, дзякуй Богу, узняліся
сцены
Ад храма на радзімічаў зямлі.
О колькі год гублялі
дрэвы лісце,
Галінкі ж выраслалі зноў і зноў.
А старажытны род,
як і калісьці,
У зямлі не страчваў
мужных каранёў.
Крыжамі Свята-Троіцкага
храма
Быў шлях азораны ўсёй
старани
Мяне хрысціць сюды
насіла мама,
Як клікалі да ютрані званы.
У гэтым храме пад
праменнем свечак
І мне імя тут дадзена было.
Над сцежкаю жыццёваю
навечна
З нябёсаў загарэлася
святло.
Матуля ў Бога мне жыцця
прасіла,
Лоб акрапляючы святой
вадой,
Каб не знікала ў сэрцы
мужнасць, сіла
У змаганні ні перад якой
бядой.
На дрэвах разрасталася
зноў вецце
Крухі ахутваючы лысых пнёў.
Хоць і прайшло над храмам
ліхалецце,
Ды не кранула вечных
каранёў.
Між дрэў, якія сонца
азарыла,
Муры зноў ажыўляцца
пачалі.
І вось да настаяцеля Кірыла
Пайшлі ўсе людзі па
сваёй зямлі.
І ён удзячны ім за дапамогу,
Каб найхутчэй узняць
з нябыту храм,
Які да сонца асвятліў
дарогу
Усім землякам, усёй
зямлі дарам.
Дык хай пад залатымі
купаламі
Расчыніць дзверы храм
шырэй на ўсход.
Багата ж, кажуць,
хата не кутамі,
А хлебам тым,
што здабываў народ.

**12 студзеня 2003 года.**

**Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

**Прыходзька, П. Хоцімскі храм** : ліст ад паэта-земляка / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 2003. — 22 студзеня. — С. 1.